Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

№ 4 (46) ' 2006

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

**М. І. МІНЦКІ — галоўны рэдактар,** *кандыдат гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар**
**І. І. БАГДАНОВІЧ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. У. ЖЭРКА**

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

**У. В. ТУГАЙ — старшыня**
**М. М. ЗАБАЎСКІ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА,** *доктар педагагічных навук*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН,** *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец —**
**Установа «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

220004, г. Мінск, вул. Караля, 16; тэл.: 200-02-28 (адк. сакратар),
200-10-73 (аддзел маркетынгу), факс: 200-54-10
e-mail: aiv@aiv.by, http:/www.aiv.by

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

1. *Боннар, А.* Греческая цивилизация : в 2 т. — Ростов-на-Дону, 1994.
2. *Винничук, Л.* Люди, нравы и обычаи Древней Греции и Рима. — М., 1988.
3. История и религия : универсальная энциклопедия школьника / сост. А. А. Воротников. — Мн., 1995.
4. *Кун, Н. А.* Легенды и мифы Древней Греции. — М., 1975.
5. *Мерзлова, В. С.* Викторины по истории Древнего мира и средних веков. — Мн., 1969.
6. *Миницкий, Н. И., Ханкевич, О. И.* Преподавание истории древнего мира : учебн.-метод. пособие. — Мн., 2000.
7. *Немировский, А. И.* История Древнего мира: античность. — М., 2000.
8. *Смирнов, С. Г.* Задачник по истории Древнего мира: учеб. пособие для ср. шк. — М., 1992.
9. *Федосик, В. А., Прохоров, А. А., Евтухов, И. О.* Материалы по истории Древнего мира и Средних веков : справ. пособие. — Мн., 2004.
10. Хрестоматия по истории Древнего мира / под ред. проф. В. Г. Боруховича и проф. В. И. Кузищина. — Саратов, 1989.
11. Я иду на урок истории: Древнейшая и древняя история : кн. для учителя. — М., 1999.


---

# УЗДЫМ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА РУХУ. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

## Вывучэнне раздзела X, 8 клас

***Аляксандр Карзюк**, настаўнік гісторыі гімназіі № 11 г. Мінска*

Тэма: «Газета “Наша ніва”» — цэнтр нацыянальна-культурнага адраджэння (1, § 29).

Магчымы два варыянты ўрока. Пры першым з іх урок з'яўляецца камбінаваным, і ў яго першай частцы правяраецца хатняе заданне па папярэднім параграфе «Лютаўская рэвалюцыя на Беларусі». Пры выкарыстанні другога вывучаецца новы матэрыял пасля правядзення тэматычнага кантролю па раздзелах VIII–IX. У гэтым выпадку ў якасці хатняга вучні атрымліваюць заданне: паўтарыць п. 3–4, § 23.

### Задачы

1. *Навучання* — ахарактарызаваць беларускі адраджэнскі рух у пач. XX ст., раскрыць дзейнасць і ролю газеты «Наша ніва» ў ім і барацьбе з рускім і польскім нацыяналізмам.

2. *Развіцця* — развіццё навыкаў самастойнай работы вучняў з падручнікам, фармуліроўкі вывадаў і абагульнення матэрыялу.

3. *Выхавання* — выхаванне павагі да беларускай дзяржаўнасці, мовы, культуры, нацыянальнай самасвядомасці і годнасці вучняў.

### Ход урока

<u>1. Арганізацыйная частка.</u>

<u>2. Актуалізацыя ведаў вучняў па пытаннях:</u> што разумеецца пад нацыянальна-вызваленчым рухам? у чым былі яго прычыны на Беларусі? з чым была звязана яго актывізацыя ў пачатку XX ст.? Калі выйшла, як называлася і колькі часу выходзіла першая беларускамоўная легальная газета? Калі пачала выходзіць газета «Наша ніва»? Якая партыя стала ініцыятарам яе стварэння? Хто з дзеячаў беларускай культуры ўдзельнічаў у яе выданні?

<u>3. Вывучэнне новага матэрыялу</u> (на аснове самастойнай пазнавальнай работы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з падручнікам па выкананні вучэбных заданняў).

Настаўнік называе тры варыянты вучэбных заданняў.

1. Вывучыць п. 1–2 § 29 і скласці праграму газеты «Наша ніва» па палітычных, эканамічных і нацыянальна-культурных пытаннях, а пасля вылучыць і растлумачыць галоўныя напрамкі яе дзейнасці.

2. Вывучыць п. 3 § 29 і на падставе гэтага пабудаваць і растлумачыць схему «Нашаніўскае выдавецтва». Прааналізаваць змест публікацый у газеце за першыя тры гады яе існавання і зрабіць свае высновы аб накіраванасці і ідэйным змесце выдання.

3. Вывучыць п. 4–5 § 29 і вызначыць цяжкасці ў нацыянальна-культурным руху на пачатку XX ст., канкрэтныя заслугі ў ім «Нашай нівы» і напрамкі міжнародных сувязей газеты.

Пасля завяршэння работы і заслухоўвання адказаў вучняў фармулюецца ўрочны вывад аб ролі і месцы «Нашай нівы» ў гісторыі культуры і нацыянальнага адраджэння Беларусі.

4. Выніковы этап урока.

**Дамашняе заданне**

Вывучыць § 29, скласці кароткі нататак пра нацыянальна-культурную дзейнасць аднаго з дзеячаў «Нашай нівы» — братоў Луцкевічаў, В. Ластоўскага, А. Уласава, С. Палуяна і інш. (5 узровень).

**Тэмы 2–3.** Адукацыя і навука. Друк. Бібліятэкі (1, § 30). Літаратура. Тэатр і музыка. Жывапіс (1, § 31).

На вывучэнне гэтых тэм у праграме адводзіцца па адной гадзіне на кожную. Улічваючы пераемнасць і сугучнасць гэтых тэм з ужо вывучаным матэрыялам па гісторыі беларускай культуры XIX ст. (§§ 7–9, 18–19), а таксама тое, што яе вывучаюць у канцы навучальнага года, на першым уроку настаўнік праводзіць аглядную лекцыю па § 30–31. У ходзе яе школьнікі складаюць разгорнуты план, затым адбываецца ўрок-гульня «Культура Беларусі ў пачатку XX ст.», распрацоўка якога прапануецца ніжэй.

**Задачы**

1. *Навучання* — пашырэнне, паўтарэнне і канкрэтызацыя ведаў вучняў пра асноўныя з'явы, падзеі і дзеячаў беларускай культуры пачатку XX ст.

2. *Развіцця* — развіццё творчых інтэлектуальных здольнасцей вучняў, іх пазнавальнай актыўнасці, умення працаваць у камандзе.

3. *Выхавання* — выхаванне таварыскіх адносін, пачуцця суперажывання, стварэнне сітуацыі поспеху.

**Сродкі навучання:** карта Беларусі, кнігі і выданні Янкі Купалы (2), Якуба Коласа, М. Багдановіча, Цёткі, В. Ластоўскага, гульнявыя матэрыялы.

**Ход урока**

1. Арганізацыйная частка ўрока.

Настаўнік паведамляе вучням тэму і мэты ўрока, тлумачыць форму яго правядзення, пасля чаго дзеліць клас на 2–3 каманды на чале з капітанамі. За кожны правільны адказ камандзе налічваецца 1 бал, за няправільны — 0 балаў.

2. Асноўная частка ўрока.

Выкананне тэставых заданняў камандамі

*Тэставая картка 1*

**1. Пачатковую адукацыю давалі:**
а) царкоўна-прыходскія школы;
б) гарадскія вучылішчы;
в) прагімназіі;
г) рэальныя вучылішчы.

**2. Аўтарам трохтомніка «Беларусы» з'яўляецца:**
а) М. Федароўскі;
б) Е. Раманаў;
в) Я. Карскі.

**3. Нарыс «Кароткая гісторыя Беларусі» быў апублікаваны В. Ластоўскім у:**
а) 1916 г.;
б) 1910 г.;
в) 1917 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**4. Суаднясіце прозвішчы беларускіх пісьменнікаў і іх псеўданімы:**

а) Янка Купала; 1) А. Пашкевіч;
б) Якуб Колас; 2) К. Каствравіцкі;
в) Карусь Каганец; 3) І. Луцэвіч;
г) Цётка. 4) К. Міцкевіч.

**5. У 1911 г. Алесь Бурбіс стварыў:**

а) Першае таварыства беларускай драмы і камедыі;
б) Беларускі музычна-драматычны гурток;
в) Першую беларускую трупу.

*Тэставая картка 2*

**1. Актыўным удзельнікам нелегальнага з'езда настаўнікаў у 1906 г. быў:**

а) Янка Купала;
б) Якуб Колас;
в) М. Багдановіч.

**2. Вывучэннем гісторыі ВКЛ у пачатку XX ст. займаўся:**

а) В. Ластоўскі;
б) Е. Раманаў;
в) М. Доўнар-Запольскі.

**3. Папярэдняя цэнзура ў друку была ліквідавана ў:**

а) 1905 г.;
б) 1906 г.;
в) 1913 г.

**4. Суаднясіце імёны пісьменнікаў і назвы іх зборнікаў:**

а) Янка Купала; 1) «Скрыпка беларуская»;
б) Якуб Колас; 2) «Шляхам жыцця»;
в) Цётка; 3) «Вянок»;
г) М. Багдановіч. 4) «Песні-жальбы».

**5. Прызнаным майстрам пейзажнага жывапісу ў пачатку XX ст. з'яўляўся:**

а) Я. Кругер;
б) Ю. Пэн;
в) В. Бялыніцкі-Біруля.

*Пытанні для кароткіх вусных адказаў (для каманднага абмеркавання)*

1. Што такое «тэорыя афіцыйнай народнасці»?

2. Хто называўся «дарэктарам»? Хто з беларускіх пісьменнікаў навучаўся ў іх?

3. Назавіце самую буйную бібліятэку ў Беларусі.

4. Назавіце паэмы Янкі Купалы, напісаныя да 1917 года.

5. Хто быў стваральнікам Першай беларускай трупы?

6. Якія жанры жывапісу былі найбольш распаўсюджанымі ў пачатку XX ст.?

7. Назавіце галоўныя тэмы творчасці М. Багдановіча.

8. Чаму беларуская літаратура пачатку XX ст. называецца «нашаніўскай»?

*Конкурс капітанаў*

Капітанам каманд прапануецца на выбар 2 заданні:

а) прачытаць на памяць верш аднаго з беларускіх паэтаў пачатку XX ст.;

б) вызначыць аўтарства прапанаваных урыўкаў з наступных вершаў:

- «Слуцкія ткачыхі», «Раманс», «Пагоня» (М. Багдановіча);
- «Ворагам беларушчыны», «Роднае слова», «Маладая Беларусь» (Янка Купала);
- «Родныя вобразы», «Мужык» (Якуб Колас).

*Творчае заданне*

Камандам прапануецца прааналізаваць малюнкі В. Бялыніцкага-Бірулі «Блакітная капліца» і К. Каствравіцкага «Тып беларуса», змешчаныя ў тэксце § 31 падручніка (1, с. 280–281). На

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

працягу 5 хвілін вучні павінны вызначыць іх жанр і раскрыць асаблівасці з улікам біяграфіі і светапогляду аўтараў. Большую колькасць балаў атрымлівае каманда, якая дае найбольш поўны, грунтоўны і пераканаўчы адказ.

2.5. Падлік колькасці балаў, рэфлексія ўдзельнікаў і выстаўленне адзнак (у канцы гульні).

3. Выніковы этап урока.

Вучням даецца дамашняе заданне: паўтарыць § 30–31.

*Багдановіч, М.* Поўны збор твораў : у 3 т. — Т. 1. — Мн., 1992.

*Біч, М. В.* Гісторыя Беларусі. Канец 18 ст. — 1917 г. : вучэб. дапам. для 8-га кл. — Мн., 1998.

Вывучаем гісторыю Беларусі. 8 клас / уклад. Т. А. Жук. — Мазыр, 2001.

Гісторыя Беларусі ў табліцах і схемах. Са старажытнейшых часоў да сучаснасці / уклад. Л. М. Нагорная, А. В. Цімашэй. — Мн., 1999.

*Купала, Я.* Жыве Беларусь. — Мн., 1993.

*Ластоўскі, В.* Кароткая гісторыя Беларусі. — Мн., 1992.

*Трыгорлава, Л.* Газета «Наша ніва» — цэнтр нацыянальна-культурнага адраджэння // Беларускі гістарычны часопіс. — 2000. — № 1.

*Шарова, Н. С.* і інш. Тэставыя заданні па гісторыі Беларусі. — Мн., 2002.

# ДИАЛОГ НА УРОКАХ ИСТОРИИ

***Наталья Дерябина**, учитель высшей категории гимназии № 2 г. Барановичи*

Ведущим принципом построения исторического образования в школе стала гуманизация истории. Под ней понимается переориентация системы образования на интересы и потребности ученика, удовлетворение его познавательных, мировоззренческих запросов. Она проявляется не только на содержательном, но и на процессуальном уровне (отказ от авторитарности педагога, переход к сотрудничеству, совместной деятельности). В этой связи актуальным становится переход от монологических технологий преподавания истории к диалогическим. Главные условия для этого — преобразование собственного педагогического мышления, принятие гуманистических установок педагогического поведения, знание дидактических особенностей диалогового общения.

Полагаем, что само содержание исторического образования позволяет организовать обучение как диалог, как вопросы к каким-либо пластам прошлого и поиск на них ответов. В данной статье предпринята попытка актуализировать позитивную роль диалогового характера обучения.

*Диалог* — это логико-коммуникативный процесс, при котором субъекты взаимодействуют посредством своих смысловых позиций:

- диалог позволяет сделать внешними внутренние процессы мышления;
- ведется в категории исторических понятий, проблем;
- актуализирует важнейшие функции личности;
- возможности познания определяются мышлением и деятельностью (коммуникативно-диалоговой).

Учитель должен создать условия для самостоятельного мышления ученика. Из-за наличия индивидуальных различий школьников возникает проблема, как организовать работу, чтобы она активизировала работу каждого из них. Решение этого вопроса связано с необходимостью проведения *диагностики* готовности учеников к диалоговому общению.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ